# КАРАВАШКІН УЛАДЗІСЛАЎ КАНСТАНЦІНАВІЧ



Мастак. Нарадзіўся 12.02.1926 г. ў г. . У 11 гадоў прыняты ў спецыяльную школу для адораных дзяцей імя Сурыкава ў Маскве, дзе і правучыўся да пачатку вайны, якая разам перакрэсліла ўсе мары юнака. З першых дзён вайны працуе вучнем, потым токарам на ваенным заводзе, а ў 1943 г. добраахвотнікам пайшоў на фронт.

З 1945 года вучыўся ў ваенным вучылішчы, потым служыў у арміі ў Венгрыі. У 1959 г. прыехаў на Беларусь, потым вучыўся ў мастацкім універсітэце імя Крупскай. Работы Уладзіміра Канстанцінавіча неаднаразова экспанаваліся на абласных і рэспубліканскіх выстаўках: у Маскве, Літве, Польшчы. Карціны прысвечаны прыгажосці роднага Воранаўскага краю, яго прыродзе: “Рабінавыя гронкі” (1974), “Цёплы вечар” (1975), “Асенні парк” (1976), “Зімовая казка” (1979), “Талая вада” (1981), “І зноў вясна” (1985) і інш. Яго пейзажы прываблiваюць сваёй псіхалагічнай дакладнасцю і незвычайнай паэтычнасцю. У. К. Каравашкін — удзельнік 14 замежных выстаў (ЗША, Англія, Францiя, Бельгія, Балгарыя, шматразова ФРГ, ГДР, Фінляндыя, Турцыя і інш.).

**Бібліяграфія:**


1.Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Воранаўскага раёна / рэд.кал.: Г.П.Пашкоў (гал. рэд.) і інш.; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск: БелЭн, 2004. – С. 497.